# КОНКУРС: ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСІ ПРАЗ АБ'ЕКТЫЎ ФОТАКАМЕРЫ

ДОМ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА ВІЛЬНЮС

10 снежня 2008 году спаўняецца 60 гадоў з дня прыняцця Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. Да юбілею гэтага найважнейшага інструмента **Беларускі Дом правоў чалавека ў Вільні** ладзіць конкурс на найлепшую фатаграфію, якая ілюструе ажыццяўленне якога заўгодна права ці свабоды чалавека ў Беларусі. Конкурс ладзіцца ў дзвюх намінацыях:

1. Найлепшае прафесійнае фота (аўтары - прафесійныя фатографы)
2. Найлепшае аматарскае фота

Паводле вынікаў конкурсу, у кожнай з намінацыяў будзе адабраная найлепшая фатаграфія, аўтар якой атрымае прыз - паездку ў Вільню на двух чалавек на выходныя альбо грашовую прэмію. Астатнія фатаграфіі будуць уключаныя ў экспазіцыю "Правы чалавека праз аб'ектыў фотакамеры", якая будзе праходзіць у Доме правоў чалавека ў Вільні.

Фатаграфіі будуць ацэньвацца міжнародным журы, у склад якога ўвойдуць прадстаўнікі Дамоў правоў чалавека ў Осла, Лондане, Маскве, Сараеве. Пераможцы будуць абвешчаныя **10 снежня 2008 году**.

**Умовы ўдзелу ў конкурсе**

1. Удзельнічаць у конкурсе могуць грамадзяне альбо жыхары Беларусі.
2. Да ўдзелу ў конкурсе прымаюцца арыгінальныя працы, якія адпавядаюць патрабаванням Закону аб аўтарскім праве Літоўскай Рэспублікі. Забараняецца паданне чужых прац без пазначэння аўтарства і пісьмовага дазволу аўтара на выкарыстанне фатаграфіі для ўдзелу ў конкурсе.
3. Адзін аўтар можа падаваць на конкурс не больш за тры працы.
4. Фатаграфіі не могуць быць вынікам фотакалажу.
5. Удзел у конкурсе прадугледжвае перадачу фатографам правоў ДПЧ на выкарыстанне матэрыялаў, прадстаўленых на конкурс, на наступных выставах і ў публікацыях ДПЧ, прысвечаных правам і свабодам чалавека.
6. Працы прымаюцца да **30 лістапада 2008 году** на адрас: belarus@humanrightshouse.org з пазнакай "Правы чалавека - конкурс".

**Тэхнічныя патрабаванні да конкурсных прац**

1. Фатаграфіі могуць быць як каляровыя, гэтак і чорна-белыя.
2. Фатаграфіі прадстаўляюцца ў фармаце JPEG з пашырэннем 300 dpi. Якасць лічбавай выявы павінна дазволіць надрукаваць фатаграфію фарматам не менш за А3 для экспанавання на выставе.
3. Працы павінны быць аформленыя ў выглядзе архіву ZIP альбо RAR, назва архіву павінна ўтрымліваць імя і прозвішча ўдзельніка ў лацінскай транскрыпцыі, а таксама намінацыю, у якой удзельнічае аўтар (для прафесійнай фатаграфіі - NOM1, для аматарскай - NOM2). Прыклад назвы архіву: Jan_Janavic_NOM1.zip
4. Акрамя фатаграфій архіў павінен утрымліваць файл, у якім тлумачыцца, якое менавіта права чалавека ілюструе канкрэтная фатаграфія. Тыя, хто ўдзельнічае ў намінацыі "Найлепшае прафесійнае фота", таксама дасылаюць сціслае рэзюмэ.

**Конкурс ладзіцца пры падтрымцы**

Konrad Adenauer Stiftung — Фундацыі імя Конрада Адэнаўэра

Міністэрства замежных спраў Нарвегіі

LITHUANIAN DEVELOPMENT COOPERATION — Міністэрства замежных спраў Літвы

Фундацыі дамоў правоў чалавека (Нарвегія)

Па ўсіх узніклых пытаннях звяртайцеся ў аргкамітэт на адрас: belarus@humanrightshouse.org, альбо па тэлефону ў Вільні: +370 5 212 7703.